**10 жніўня 2026 г. – 80 гадоў з дня нараджэння Ніны Мефодзіеўны Пліско (Кладчанка), былога дырэктара музея імя А. В. Суворава**



Ніна Мефодзіеўна Пліско нарадзілася 10 жніўня 1946 года ў вёсцы Боркі Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. У сям'і гадаваліся шасцёра дзяцей: чацвёра сыноў і дзве дачкі, з якіх Ніна - самая малодшая. Бацьку запрасілі працаваць бухгалтарам у саўгас «Патрыкі» Кобрынскага раёна, сям'і далі службовае жыллё. Так сям'я Пліско апынулася на Кобрыншчыне. У 1957 годзе ва ўзросце 46 гадоў у час хірургічнай аперацыі памёр бацька Мефодзій Пліско. Маці засталася адна з дзецьмі і прыняла нялёгкае рашэнне – аддаць малодшую Ніну у школу-інтэрнат у Брэсце. Там дзяўчынка вучылася з 7 по 11 клас.

Дарослае жыццё пачалося адразу пасля школы. Ніна паехала ў Калінінград, дзе ў той час жылі яе браты. Працавала і ў сталовай, і на касе, і кандуктарам. Потым паступіла на завочнае аддзяленне Калінінградскага тэхнічнага інстытута і закончыла курсы экскурсаводаў, таму шта патрэбна было самой зарабляць на жыццё. На другім курсе Ніна вышла замуж, нарадзіўся сын Сяргей і вучобу ў Калінінградзе прышлося пакінуць. У 1971 года маладая сям'я пераехала ў Кобрын. Ніна пачала працаваць экскурсаводам у Брэсцкім бюро вандраванняў і экскурсій, вазіла групы ў Брэсцкую крэпасць. Прывозіла гасцей і ў Кобрынскі музей. Менавіта там яна пазнаёмілася з дырэктарам Аляксеям Мартынавым, які потым запрасіў яе на работу ў Кобрынскі музей.

У 1972 годзе Ніна Мефодзіеўна Пліско стала малодшым навуковым супрацоўнікам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея. У гэтым жа годзе нарадзіўся малодшы сын Якаў. У 1974 годзе маладая жанчына паступіла на гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (цяпер імя М. Танка). Ніна Мефодзіеўна хутка падымалася па кар'ернай лесвіцы: на працягу трох гадоў - малодшы навуковы супрацоўнік, наступныя тры гады - старшы навуковы супрацоўнік, а з 1978 года - дырэктар музея. На гэтай пасадзе Пліско
Н. М. прапрацавала 26 гадоў.

Прыступіў да новай пасады дырэктара музея, Ніна Мефодзіеўна разгарнула маштабную дзейнасць. У 1978–1980 гадах пад яе кіраўніцтвам прашла рэканструкцыя дома XVIII стагоддзя, дзе была створана экспазіцыя «Дом А.В. Суворова». Дырэктар ініцыяніравала будаўніцтва яшчэ аднаго будынка музея, курыравала праектныя і тэхнічныя работы. У 1989 г. будынак быў

уведзены ў эксплуатацыю. Пад кіраўніцтвам Пліско Н. М. пачалася карпатлівая работа па стварэнню экспазіцыі.

У 1995 г. адбылося адкрыццё экспазіцыі па ваеннай гісторыі Кобрыншчыны, размешчанай у 16 залах. Аўтарам навуковай канцэпцыі новай экспазіцыі па гісторыі горада Кобрына и тэматыка-экспазіцыйнага плана з'яўлялася Н. М. Пліско. Дзякуючы настойлівасці, ініцыятыве, арганізатарскім здольнасцям кіраўніка экспанаты дачакаліся свайго часу, музей атрымаў новы будынак, а горад - архітэктурную жамчужыну.

Уклад Н. М. Пліско ў музейную справу вымяраецца не толькі новымі квадратнымі метрамі. За час яе кіраўніцтва музейны фонд вырас у чатыры разы, папоўніўшыся ўнікальнымі калекцыямі, сярод якіх клад манет XVII века, які налічвае 6200 манет Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Н. М. Пліско з'яўляецца аўтарам даведніка па музею (Мн., 1990 г.), сааўтарам гісторыка-эканамічнага нарыса «Кобрын» з цыкла «Города Белоруссии» (Мн., 1987 г.), складальнікам і адным з рэдактараў гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Кобрынскі раён» (Мн., 2002 г.), аўтарам шэрагу гістарычных публікацый у рэгіянальных і рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі.

Пад кіраўніцтвам Н. М. Пліско Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава прымаў актыўны ўдзел у міжнародных канферэнцыях, прысвечаных жыццю і дзейнасці вялікага рускага палкаводца А. В. Суворава, падтрымліваў культурнае супрацоўніцтва з гарадамі-пабрацімамі Ульцен (Германія) і Гларус (Швейцарыя). Пятнадцатага верасня 1999 года з Кобрына стартавала экспедыцыя, прысвечаная 200-годдзю перахода праз Альпы расійскай арміі пад камандаваннем А. В. Суворава. У складзе групы была Ніна Мефодзіеўна Пліско. 24-26 верасня ў горадзе Андерматте (Швейцарыя) прайшоў Міжнародны калоквіум, дзе Н. М. Пліско зачытала свой даклад на нямецкай мове.

Заслугі Ніны Мефодзіеўны на рэспубліканскім узроўне прызнаны настолькі значнымі, что інфармацыя аб ёй уключана ў энцыклапедыю «Кто есть Кто. Деловой мир СНГ», выдадзеную ў 2001 годзе ў Мінску пад редакцыяй І. В. Чекалава.

Ніна Мефодзіеўна ўзнагароджана Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За личный вклад в развитие белорусской культуры» (2000), Дыпломам Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта як пераможца раённага спаборніцтва «Мы славу Кобрина трудом умножим» (2012), Нагрудным знакам ветэрана 4-й арміі Западного фронта «В память о боевых делах в годы Великой Отечественной войны» (1974). Но

самае дарагое прызнанне – гэта тысячы наведвальнікаў, якіх музей прымаў штогод і прадаўжае прымаць сёння.

З 2004 г. Н. М. Пліско (Кладчанка) знаходзіцца на заслужаным адпачынку, але па-ранейшаму прымае актыўны ўдзел у жыцці музея.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2026 г.
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Галавейка Таццяна Аляксееўна,
загадчык аддзела маркетынгу,
сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

**Кобринский** военно-исторический музей имени А. В. Суворова : путеводитель / автор текста Н. М. Плиско. – Минск : Полымя, 1984. – 47 с. : ил.1.

**Пліско, Н.** Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава. Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова : даведнік / Н. Пліско. – Мінск, 1990. – 93 с., іл.

**Кобрынскі** ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава / Н. М. Пліско // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 500–502.

**Плиско** Нина Мефодиевна // Кто есть Кто: Деловой мир СНГ.– Минск, 2004. – С.163. : фот.

**Кирилюк, Л.** Н. Музей как дело всей жизни / Лилия Кирилюк // Кобрынскі веснік. - 2026. - 14 сакавіка (№ 11). - С. 15. : фот.

Почетный знак Министерства культуры Республики Беларусь "За личный вклад в развитие белорусской культуры", которым в 2000 году была награждена бывший директор Кобринского военно-исторического музея Нина Мефодиевна Плиско (Кладченко), представлен в музейной витрине.

**Якубец, Н.** #Равнение на героев. Человек слова и дела / Нина Якубец, Евгений Мурин, Нина Кладченко // Кобрынскі веснік. - 2024. - 27 красавіка (№ 17). - С. 7. : фот.

**Ефтифеева, Н.** Случайная профессия на всю жизнь / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2021. - 12 августа (№ 32). - С. 2. : фот.

**Кладченко, Н.** Реальная роль великого российского полководца А.В. Суворова в истории белорусской государственности / Нина Кладченко // Кобрин-информ. - 2016. - 2 июня. - С. 5.

**Белов, Д.** У музея - юбилей // Кобрынскі веснік. - 2016. - 28 верасня (№ 78). - С. 2. : фот.

**Плиско, Н. М.** Из истории одного музея / Н. М. Плиско // Кобрин-информ. - 2010. - 18 ноября. (№46). - С. 30.

**Плиско, Н. М.** 200-летию перехода А. В. Суворова посвящается / Н. М. Плиско // Кобрынскі веснік. – 1999. – 11 верасня (№ 73). – С. 1.

**Плиско, Н. М.** Это и их город. / Н. М. Плиско // Кобрынскі веснік. – 1999. – 17 июля (№ 57). – С. 2.

**Плиско, Н.** Мы не боимся угроз / Н. Плиско // Кобрынскі веснік. – 1995. – 19 красавіка (№ 31). – С. 2.

**Плиско, Н.** Не дадим в обиду Суворова / Н. Плиско // Кобрынскі веснік. – 1991. – 9 красавіка (№ 68). – С. 4.

**Плиско, Н.** Агульная памяць [Да Міжнароднага дня музеяў] / Н. Плиско // Камуністычная праца. – 1988. – 17 мая (№ 59). – С. 1.

**Пліско, Н. М.** Выхоўваць памяццю / [Н. М. Пліско ; гутарыла] Т. Канапацкая // Камуністычная праца. – 1986. – 26 чэрвеня. – С. 3.

**Пліско, Н.** Цэнтры выхавання, асветы / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1982. – 15 мая.

**Пліско, Н.** Запрашае музей імя А. В. Суворова / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1981. - 19 мая.

**Усе прысвечана** палкаводцу / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1981. – 1 мая.

**Пліско, Н.** Новае ў нашым музеі / Н. Пліско // Камуністычная праца. – 1977. – 3 лютага.

Рэгіён:
Кобрынскі раѐн

Імёны:
Пліско Ніна Мефодзіўна

Прадметы:
Знакаміты грамадзянін Кобрынскага раёна
Музей імя А. В. Суворава